Усмешку выклікаюць і згадкі пра Фанвізіна, і ненапісаная п’еса «Чайка». У фінале драматург з лёгкасцю вырашае лёс аўтарства адрыццяў і вынаходніцтваў: сястра Агнеса знішчыла ўсе запісы, дзённікі і механізмы Пане Каханку, прызнаючы, што яго адкрыцці апярэдзілі час.

Вобраз галоўнага героя намаляваны з гратэскам, але без ідэалізацыі, герой мае станоўчыя і адмоўныя рысы, а іронія і гумар дапамагаюць аўтару перацягнуць на свой бок чытача, данесці праз зразумелы гумар і разуменне аўтарскай канцэпцыі. Галоўны герой – чалавек глыбокі, з выразна акрэсленай жыццёвай пазіцыяй, які не саромеецца быць смешным, але і не дазволіць кпіць з сябе. Магчыма, так і мог бы выглядаць у літаратуры эпохі постмадэрнізму гэты герой. Бо менавіта так вызначыў сваю задумку замоўца-рэжысёр С. Кавальчук: «Нам трэба было з дапамогай гістарычнага міфу задаць сённяшнія пытанні» [2, с. 11].

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Курейчик А.* Пане Коханку // Антология современной белорусской драматургии / [сост. Т. Ф. Рослик]. Минск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016. С. 398–450.
2. *Цімошык Л.* Спектакль «Пане Коханку»: «Караль, які не стаў каралём» // Культура. 2010. № 12.

## БЛОГІ Ў СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ РАЁННЫХ ВЫДАННЯХ: ТРАНСФАРМАЦЫЯ ГАЗЕТНАЙ КАЛОНКІ

***І. А. Івашка***

*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова*
*«Выдавецкі дом “Педагагічная прэса”» /*
*Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета»,*
*пр. Незалежнасці, 77–110, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*ivashkoirina9@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці падачы інфармацыі ў электронных версіях сучасных беларускіх раённых газет з дапамогай блогінгу і калумністыкі. Вылучаны аспекты, паводле якіх розніца паміж формамі «блог» і «калонка» нівеліруюцца.

***Ключавыя словы:*** «Адзінства»; «Трыбуна працы»; «Родны край»; блог; калонка; раённыя СМІ.

# BLOGS IN MODERN BELARUSIAN REGIONAL PUBLICATIONS: TRANSFORMATION OF A NEWSPAPER COLUMN

***I. A. Ivashka***

*Editorial and publishing institution*
*«Publishing house "Pedagogical press"» /*
*Editorial office of the newspaper «Nastaunitskaya gazeta»,*
*77–110, Nezavisimosti Av., 220013, Minsk, Belarus*
*Corresponding author: I. A. Ivashka (ivashkoirina9@gmail.com)*

The article deals with the features of providing information in electronic versions of modern Belarusian regional newspapers using blogging and columnism. The aspects according to which the difference between the «blog» and «column» forms is leveled are highlighted.

***Key words:*** «Adzinstva»; «Trybuna pracy»; «Rodny krai»; blog; column; regional mass media.

Тэматычныя аўтарскія рубрыкі ў СМІ Беларусі выклікаюць павышаны інтарэс чытачоў. Асаблівая ўвага накіравана на калумністыку, якая ў сучаснай медыяпрасторы прадстаўлена на розных пляцоўках («Неличный субъектив» Алены Ляўковіч («Звязда»), «Колонка Татьяны Сулимовой» («СБ. Беларусь сегодня»), калонкі «Мир», «Страна», «Я» («Рэспубліка») і інш.). Суб'ектыўнасць аўтарскай ацэнкі ў выглядзе асабістага перажывання з пэўнай нагоды набліжае журналіста да аўдыторыі, узмацняе чытацкі давер, настройвае на дыялог.

Нягледзячы на тое, што са старонак сучаснай беларускай перыёдыкі амаль зніклі калонкі галоўнага рэдактара [1, с. 299], падобныя формы захаваліся і працягваюць развівацца ў раённых газетах («Навіны Старадарожчыны», «Авангард» (Буда-Кашалёва), «Ляхавіцкі веснік», «Ганцавіцкі час», «Маяк Палесся» (Брагін), «Да новых перамог» (Клецк), «Прысталічча» (Мінскі раён), «Пухавіцкія навіны», «Кобрынскі веснік», «Петрыкаўскія навіны»). Але непарушаную перыядычнасць яны маюць у нямногіх выданнях («Навіны Старадарожчыны», «Авангард»).

Адказваючы на выклікі канвергенізацыі СМІ, раённая прэса імкнецца замацаваць свае пазіцыі ў вэб-прасторы. Так, у лічбавым асяроддзі калонка нярэдка трансфармуецца ў блог і абодва тэрміны становяцца сінанімічнымі. Агульнымі ў іх з'яўляюцца «жывая» мова,

суб’ектыўнасць інтэрпрэтацыі падзей, вытрыманая перыядычнасць і адкрытасць аўтара да абмену меркаваннямі. Да таго ж, зварот да абедзвюх форм, з пункту гледжання даследчыка І. Каралёва, тлумачыцца патрэбай людзей ў рэальных эмацыйных зносінах [2, с. 438]. Адрозненне форм – у арганізацыі тэксту (калонка найчасцей раскрывае тэму без выкарыстання тэхнічных сродкаў, а блог, як правіла, падмацоўвае ключавую думку, калі гэта дарэчна, ілюстрацыйным матэрыялам).

Сёння наяўнасць блогаў заяўлена на сайтах раённых выданняў Барысава («Адзінства» – 4 аўтары), Бераставіцы («Бераставіцкая газета» – 4), Ляхавіч («Ляхавіцкі веснік» – 1 аўтар), Смаргоні («Светлы шлях» – 8), Шчучына («Дзянніца» – 6), Бабруйска («Трыбуна працы» – 4) і Лагойска («Родны край» – 4). Сярод іх якасна вылучаюцца блогі журналістаў «Адзінства», «Трыбуны працы» і «Роднага краю».

Вядзенне блогаў – новая стратэгія работы з падпісчыкамі, якая з’явілася ў выданнях у 2020 годзе (першыя публікацыі датуюцца чэрвенем). Найстарэйшыя інтэрнэт-дзёнікі належаць лагойскаму «Роднаму краю» (стартавалі ў 2017 годзе). Прынцыповай розніцы ў падачы калонак і блогаў на сайтах раённых газет не назіраецца, аднак у вэб-прасторы менавіта блог з’яўляецца найбольш канкурэнтаздольнай і дзейснай формай арганізацыі матэрыялаў, данясення інфармацыі да аўдыторыі.

Блогі барысаўскай газеты адрозніваюцца структураванасцю, адзінствам канцэпцыі і скіраванасцю на інтарэсы рознаўзроставай аўдыторыі. Кожны аўтар стварае матэрыялы пэўнай тэматыкі. Таццяна Саковіч прысвяціла блог рэцэнзаванню сучаснай мастацкай літаратуры (запіс «Свежевыжатый “June”: непопулярное книжное мнение о романе Д. Быкова “Июнь”»), Сняжана Цішкавец піша для будучых маці («Беременность. Токсикоз. И мое спасение»). Яўгеній Алпатаў пазіцыянуе сваю сеткавую старонку як пляцоўку, дзе змяшчаюцца матэрыялы, якія не ўпісваюцца ў фармат газеты, але маюць права дайсці да чытача («матэрыялы любых гадоў, не прывязаныя да месца і часу» [3] – «Найти свой клад», «Колыбельная в решете времени», «Мальчишеская дружба»). Блог Святланы Чакалавай вучыць аўдыторыю капірайтынгу. Ад іншых інтэрнэт-дзённікаў «Адзінства» яго адрознівае паслядоўнасць і перыядычнасць (3-4 разы на месяц) данясення матэрыялу. Агульная асаблівасць блогаў бабруйскай раёнкі – практычнасць (вывады журналістаў можна прымяніць ці пратэсціраваць), экспертнасць (раскрыццё думкі з пазіцыі «праверана на сабе»), абгрунтаванне пазіцыі (лагічнасць вывадаў і іх падмацаванне фактамі).

Блогавыя запісы «Трыбуны працы» не маюць размежавання і публікуюцца пад агульным разделам «Мысли вслух» (тэг – «Свет глазами журналиста»). Увага аўтараў (Валянціны Мілохінай, Алены Карпенка, Вольгі Грэк, Іны Багдановіч) скіравана прыярытэтна на сацыяльную праблематыку. У большасці запісаў прасочваецца алгарытм «пазіцыя А + пазіцыя Б + пазіцыя журналіста = роздум для чытача»: «Кто из них прав? По закону, бесспорно, жильцы квартиры с новорожденной девочкой. Но чисто по-человечески я от всей души отвесила бы тому дяде Васе хорошего “леща”», – матэрыял «Подал пример – пожинай плоды»; «Однако после моих слов, что защищаю я не себя от него, а его от себя, потому что у меня коронавирус, мужчина изменился в лице и, ойкнув, быстро удалился. И куда его бравада, спрашивается, делась?», – «Чему быть, того не миновать?..» [4].

«Родны край» таксама змяшчае матэрыялы неструктуравана. Запісы журналістаў тут утвараюць агульнарэдакцыйны блог. У полі зроку Аляксандра Клімаўца, Валянціны Корзун, Алены Масцеравай, Ірыны Станкевіч знаходзяцца кіно, медыцына, культурныя падзеі, сацыяльныя пытанні і выпадкі з асабістага жыцця.

«Агульнарэдакцыйны» дзённік адрознівае высокі ўзровень інтэрактыўнасці. Журналісты часта дзеляцца вопытам, апісваюць уласныя звычкі, што сцірае мяжу паміж імі і чытачамі («Я прихожу с работы домой, и меня встречает мама. Она рассказывает о том, чем занималась день, показывает свежесвязанный носочек или часть вышивки, интересуется моим рабочим днем», – матэрыял «Счастье мое…»; «Яркай кропкай стала песня “Вясна”, пад якую я закатвала апошнія слоікі бярозавіку», – «Застацца сабой у краіне фэйкаў»; «Тут же меня постигло разочарование: лента оказалась производства телеканала “НТВ”», – «Отличный сериал для просмотра в большой выходной» [5]).

Таксама блог выдання адметна вылучае дыялагічнасць, якую ўмацоўвае пачуццё гумару аўтараў: «…Долгое время в редакцию газеты шли письма от одной сельчанки. Она делила с невесткой корову. Корову, которая, кстати, была чуть ли не старше меня. <…> …По мнению бабули, соседи насадили вдоль дорожки к ее крыльцу крапиву, чтобы она сожгла себе ноги. <…> …Запускают к ней в дом через электрическую розетку… газ» – запіс «Юридически подкованная пенсионерка достанет жалобами любого чиновника…»; «Историю логойской милиции я знала не хуже замполита, оперативную обстановку – не хуже начштаба» – «Для меня это тоже праздник» і інш. [5].

Па словах І. Каралёва, розніца паміж блогам і калонкай у тым, што чытачы блога, у адрозненне ад чытачоў вэб-версіі газеты, лепей знаёмы з асобай аўтара і валодаюць кантэкстам, што дазваляе апошняму «гуляць» з аўдыторыяй, робячы свае тэксты больш інтэртэкстуальнымі і інтэрактыўнымі [2, с. 439]. Аднак у раённым выданні адрозненні нівеліруюцца за кошт абмежаванай тэрыторыі ахопу СМІ і вядомасці журналістаў шырокаму колу падпісчыкаў.

Такім чынам, нягледзячы на тое што шмат даследчыкаў (І. Каралёў, Ю. Гардзееў, А. Дзямідаў, Л. Кройчык і інш.) размяжоўваюць катэгорыі «калонка» і «блог», праз асаблівасці развіцця раённай прэсы (неналаджанасць менеджменту сайта, абмежаваныя тэхнічныя сродкі, кропкавая паглыбленасць у працэс лічбавізацыі і інш.) межы паміж гэтымі фарматамі сціраюцца. І пакуль гэтыя аспекты не ліквідаваны, «электронныя версіі газет, – лічыць С. Ярцава, – будуць пазіцыянаваць у якасці блогаў тое, што ў друкаваных выданнях выходзіць пад рубрыкай «калонка» [6, с. 11].

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Саянова (Тумилович) Н*. Колумнистика в современной белорусской прессе // Слова ў кантэксце часу: матэрыялы IV Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння д-ра філал. навук праф. А. І. Наркевіча, Мінск, 14–15 сак. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2019. С. 297–300.
2. *Королев И. А*. Трансформация колумнистики в онлайн-среде Беларуси: колумнистика и блоггинг // 75-я научная конференция студентов и аспирантов БГУ [Электронный ресурс] : материалы конф. в 3 ч. Ч. 3. Минск, 14–23 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т, Гл. упр. науки; редкол.: В. Г. Сафонов (пред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2018. С. 437–440.
3. Блог Евгения Алпатова. Газета Единство [Электронный ресурс]. URL: https://edinstvo.by/category/alpatov/ (дата обращения: 01.09.2020).
4. Блоги журналистов «районки» [Электронный ресурс]. URL: https://www.tribunapracy.by/tag/musli-vslyh/ (дата обращения: 01.09.2020).
5. Блоги [Электронный ресурс]. URL: http://logoysk.by/web/index.php?r=blogger%2Flist (дата обращения: 01.09.2020).
6. *Ярцева С. С*. Колумнистика: история возникновения и перспективы развития // автореф. дис. ... канд. филол. наук. Воронеж : Воронеж. гос. ун-т, 2011. 22 с. [Электронный ресурс]. URL: https://www.dissercat.com/content/kolumnistika-istoriya-vozniknoveniya-i-perspektivy-razvitiy (дата обращения: 01.09.2020).